**Выбары дэпутатаў**
**мясцовых Саветаў дэпутатаў Рэспублікі Беларусь**
**дваццаць восьмага склікання**

# Справаздача па выніках назірання за этапам перадвыбарчай агітацыі

*Назіранне ажыццяўляецца актывістамі РПГА «Беларускі Хельсінкскі камітэт» і ПЦ «Вясна» ў межах кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары»*
*У назіранні ўдзельнічаюць 29 доўгатэрміновых назіральнікаў кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары»*

## I. Агульныя высновы

У параўнанні з мінулымі выбарамі дэпутатаў мясцовых Саветаў, падчас сёлетніх выбараў выдзелена значна больш месцаў для правядзення масавых мерапрыемстваў з мэтай перадвыбарчай агітацыі, сустрэч з выбаршчыкамі і размяшчэння агітацыйных матэрыялаў. Гэтыя месцы з’яўляюцца больш зручнымі. Пры прыняцці рашэнняў аб месцах агітацыі ўлады часцей кіраваліся прынцыпам “дазволена ўсё, што не забаронена”.

Значна больш кандыдатаў у параўнанні з мінулымі выбарамі падалі апавяшчэнні аб правядзенні масавых мерапрыемстваў у спрошчаным парадку. Адпаведна, павялічылася колькасць заяўленых перадвыбарчых пікетаў. Традыцыйна больш актыўна агітацыйныя перадвыбарчыя пікеты заяўлялі ў Мінску: у сярэднім 1 кандыдат заявіў каля 70 масавых мерапрыемстваў.

У параўнанні з мінулымі выбарамі дэпутатаў мясцовых Саветаў, падчас сёлетняй выбарчай кампаніі кандыдаты ў дэпутаты больш актыўна выкарыстоўвалі магчымасць стварэння выбарчага фонда для фінансавання выдаткаў па перадвыбарчай агітацыі. Тым не менш, доля кандыдатаў, якія стварылі выбарчыя фонды, застаецца невысокай (10,4%).

Толькі 35% назіральнікаў у рэгіёнах паведамілі, што мясцовыя дзяржаўныя і недзяржаўныя СМІ надрукавалі праграмы ўсіх кандыдатаў. У большасці дзяржаўных СМІ пераважалі матэрыялы пра кандыдатаў ад улады (дзеючых дэпутатаў, чыноўнікаў ці дырэктараў прадпрыемстваў) і практычна адсутнічала інфармацыі пра кандыдатаў ад апазіцыі. Назіральнікі паведамляюць пра адсутнасць партыйных улётак ці іншых альтэрнатыўных матэрыялаў. Ёсць факты рэдакцыі ці адвольнага змянення зместу агітацыйных матэрыялаў кандыдатаў ад апазіцыі, распаўсюджвання непраўдзівых ці няпоўных звестак.

Выбарчыя камісіі ў рэгіёнах пераважна не інфармавалі грамадскасць аб часе і месцы правядзення сустрэч з выбарчшыкамі.

30% назіральнікаў кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” ў рэгіёнах паведамілі, што кандыдаты былі пазбаўленыя роўных умоў, не маглі сустракацца з выбаршчыкамі ў вылучаных памяшканнях.

Як і падчас мінулых выбарчых кампаній, на карысць праўладных кандыдатаў актыўна выкарыстоўваўся адміністрацыйны рэсурс. Агітацыйная кампанія праўладных кандыдатаў вялася пераважна ў форме сустрэч з выбаршчыкамі ў актавых залах прадпрыемстваў. Удзел выбаршчыкаў у такіх сустрэчах забяспечваўся адміністрацыяй.

Адміністрацыйны рэсурс актыўна выкарыстоўвалі і дзеючыя дэпутаты, беручы ўдзел у афіцыйных мерапрыемствах. Гэтым ствараліся няроўныя ўмовы для кандыдатаў. Такая практыка апраўдваецца з боку раённых выбарчых камісій тым, што дэпутаты займаюцца сваімі непасрэднымі абавязкамі.

Не заўважана сур’езных перашкод для перадвыбарчых пікетаў, аднак сустракаліся элементы ціску на пікеты апазіцыйных дзеячоў.

## II. Прававое рэгуляванне

Прававой асновай правядзення перадвыбарнай агітацыі з’яўляюцца артыкулы 45-47 ВК.

Артыкул 45 ВК прадастаўляе грамадзянам, палітычным партыям, грамадскім аб’яднанням, працоўным калектывам, давераным асобам кандыдатаў у дэпутаты, а таксама ініцыятыўным групам права свабоднага і ўсебаковага абмеркавання перадвыбарчых праграм кандыдатаў у дэпутаты, іх палітычных і асабістых якасцяў, права на правядзенне агітацыі за ці супраць кандыдата падчас сходаў, мітынгаў, у СМІ, а таксама падчас сустрэч з выбаршчыкамі.

Згодна з часткай 7 артыкула 45 ВК, мясцовыя органы ўлады па ўзгадненні з адпаведнымі выбарчымі камісіямі вызначаюць памяшканні для правядзення сустрэч з кандыдатамі і перадвыбарчых сходаў, якія арганізуюцца выбаршчыкамі. Кандыдаты маюць права за кошт сродкаў уласнага выбарчага фонда арэндаваць будынкі і памяшканні для правядзення сустрэч з выбаршчыкамі. Будынкі і памяшканні для гэтых мэтаў даюцца на роўных умовах.

Мясцовыя органы ўлады па ўзгадненні з адпаведнымі камісіямі выдзяляюць на тэрыторыі ўчасткаў для галасавання месцы, найбольш наведвальныя грамадзянамі, для размяшчэння агітацыйных друкаваных матэрыялаў. Размяшчэнне агітацыйных друкаваных матэрыялаў у іншых месцах ажыццяўляецца з дазволу кіраўніка адпаведнай арганізацыі. У выпадку, калі кіраўнік арганізацыі дазволіў размяшчэнне ў арганізацыі агітацыйнага друкаванага матэрыялу аднаму кандыдату, ён не мае права адмовіць іншаму кандыдату ў размяшчэнні агітацыйнага друкаванага матэрыялу на тых жа ўмовах (ч. 13 арт. 45 ВК).

Артыкул 45.1 ВК прадугледжвае правядзенне перадвыбарчых агітацыйных масавых мерапрыемстваў кандыдатамі і іх даверанымі асобамі ў спрошчаным парадаку. Мясцовыя органы па ўзгадненні с адпаведнымі выбарчымі камісіямі вызначаюць месцы, дзе кандыдаты ў дэпутаты, іх давераныя асобы могуць праводзіць масавыя мерапрыемствы. Для арганізацыі масавага мерапрыемства ў спрошчаным парадку кандыдат у дэпутаты, давераная асоба кандыдата накіроўвае апавяшчэнне не пазней чым за два дні да ўмоўнай даты правядзення мерапрыемства ў мясцовы орган улады, на тэрыторыі якога плануецца яго правядзенне.

Адной з формаў агітацыі з’яўляецца выкарыстанне СМІ. Артыкул 46 прадугледжвае, што кандыдаты ў дэпутаты, палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб'яднанні, працоўныя калектывы, грамадзяне, якія вылучылі кандыдатаў, з моманту рэгістрацыі кандыдатаў карыстаюцца дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі на роўных правах. Інфармацыйныя матэрыялы пра кандыдатаў, якія распаўсюджваюцца ў сродках масавай інфармацыі, павінны быць аб'ектыўнымі і дакладнымі. У іх не павінна аддавацца перавага асобным кандыдатам.

Парадак выкарыстання дзяржаўных СМІ кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Саветаў у дэпутаты 28 склікання рэгламентаваны пастановай ЦВК ад 12 снежня 2017 г. № 46. Паводле пастановы,

эфірны час для выступаў па радыё кандыдатаў у дэпутаты прадастаўляецца па працоўных днях у перыяд з 22 студзеня па 12 лютага 2018 г. Пачатак трансляцыі выступаў – у 18.00. На выступ аднаго кандыдата ў дэпутаты павінна быць адведзена не менш за тры хвіліны. Чарговасць выступаў кандыдатаў вызначае лёсаванне. Перадвыбарчыя выступы кандыдатаў у дэпутаты ідуць у запісе.

Артыкул 47 ВК забараняе заклікі, якія заахвочваюць або маюць мэтай заахвочванне да зрыву, або адмены, або пераносу тэрміну выбараў, рэферэндуму, прызначаных у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь. Гэтыя заклікі знаходзяцца ў адным шэрагу з прапагандай вайны, заклікамі да гвалтоўнай змены канстытуцыйнага ладу, парушэння тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь. Раней заклікі да байкоту выбараў былі адной з формаў агітацыі, прадугледжанай ВК, і былі забаронены толькі ў дзень галасавання. Дадзеная норма была ўведзена ў ВК у 2013 г.

*Фінансаванне перадвыбарчай агітацыі*

У 2013 г. адбыліся значныя змены ў парадку выкарыстання дзяржаўных сродкаў на перадвыбарчую агітацыю. Цяпер сродкі бюджэта выкарыстоўваюцца выбарчымі камісіямі на выраб агульных плакатаў з біяграфічнымі дадзенымі і інфармацыйнымі матэрыяламі аб кандыдатах у дэпутаты для накіравання іх выбаршчыкам. Паводле ч. 3 арт. 13 ВК, аб’ём звестак пра кожнага кандыдата, якія размяшчаюцца ў гэтых матэрыялах, павінен быць прыкладна аднолькавым. Акруговая, тэрытарыяльная выбарчая камісія не пазней чым на чацвёрты дзень пасля рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты накіроўвае ў друк для публікацыі паведамленні аб рэгістрацыі. Адносна кожнага кандыдата ўказваецца імя, імя па бацьку, дата нараджэння, пасада (занятак), месца працы, месца жыхарства, партыйнасць, а таксама звесткі пра даходы і маёмасць у аб'ёме, які вызначаецца Цэнтральнай камісіяй. Калі кандыдат у дэпутаты раней меў судзімасць, звесткі аб гэтым таксама паказваюцца (ч. 14 арт. 68 ВК).

Участковая камісія па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў накіроўвае выбаршчыкам інфармацыю пра кандыдатаў у дэпутаты, пададзеную акруговай, тэрытарыяльнай выбарчай камісіяй.

Кандыдаты ў дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў маюць магчымасць самастойна (за кошт уласнага выбарчага фонда) арэндаваць памяшканні для сустрэч з выбаршчыкамі (ч. 8 арт. 45 ВК) і вырабляць агітацыйнаю прадукцыю.

Згодна з абноўленай рэдакцыяй арт. 48.1 ВК, права ствараць выбарчыя фонды для фінансавання выдаткаў па перадвыбарнай агітацыі атрымалі дэпутаты ўсіх узроўняў. Максімальная сума ўсіх выдаткаў са сродкаў выбарчага фонда кандыдата ў дэпутаты абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў не можа перавышаць 30 базавых велічынь, кандыдата ў дэпутаты раеннага, гарадскога (горада абласнога і раённага падпарадкавання), пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў – 10 базавых велічынь. Вызначаныя таксама абмежаванні памераў добраахвотных ахвяраванняў грамадзян і юрыдычных асоб у фонды кандыдатаў у мясцовыя Саветы (адпаведна, 2 і 5 базавых велічынь). ВК не ўрэгуляваў пытанне празрыстасці фарміравання выбарчых фондаў кандыдатаў для назіральнікаў.

## III. Правядзенне перадвыбарчай агітацыі

Згодна з Каляндарным планам, перадвыбарчая агітацыя працягвалася з дня рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў па 17 лютага 2018 г. уключна.

Сёлетняя агітацыйная кампанія праходзіла менш актыўна ў параўнанні з мінулымі выбарамі ў мясцовыя Саветы дэпутатаў, нягледзячы на больш спрыяльныя ўмовы для яе правядзення. Так, у параўнанні з мінулымі выбарамі дэпутатаў мясцовых Саветаў, падчас сёлетніх выбараў было

выдзелена значна больш месцаў для правядзення масавых мерапрыемстваў з мэтай передвыбарчай агітацыі. Пры гэтым выдзеленыя месцы з’яўляюцца больш зручнымі, чым падчас папярэдніх кампаній. Многія выканкамы пры прыняцці рашэння аб месцах для правядзення масавых мерапрыемстваў з мэтай перадвыбарчай агітацыі кіраваліся прынцыпам “дазволена ўсё, што не забаронена”. Тое самае датычыцца памяшканняў для сустрэч з выбаршчыкамі і месцаў для агітацыйных матэрыялаў. Напрыклад, у Магілёве, Пінску і іншых гарадах ў пералік прадпрыемстваў, дзе можна размяшчаць агітацыйныя плакаты кандыдатаў, дададзены прадпрыемствы сувязі, звычайна шматлюдныя.

1. *Агітацыя ў СМІ*

На пытанне “Ці друкаваліся ў мясцовых дзяржаўных і недзяржаўных СМІ праграмы кандыдатаў?”, толькі 35% назіральнікаў у рэгіёнах адказалі станоўча. У большасці дзяржаўных СМІ практычна няма інфармацыі пра кандыдатаў ад апазіцыі, не публікуюцца іх праграмы. Назіральнікі кажуць пра адсутнасць партыйных улётак ці іншых альтэрнатыўных матэрыялаў.

Напрыклад, “Гродзенская праўда” ў асноўным давала артыкулы пра кандыдатаў ад улады (дзеючых дэпутатаў, чыноўнікаў ці дырэктараў прадпрыемстваў) у форме інтэрв'ю ці прамых ліній. На сайце “Гродзенскай праўды” такіх матэрыялаў налічваецца больш за трыццаць. Сацыяльная актыўнасць і грамадзянская пазіцыя апазіцыйных кандыдатаў на старонках газеты не асвятляецца. Аналагічная сітуацыя ў баранавіцкай газеце “Наш край”, наваполацкай “Новай газеце”, “Весніку Магілёва” і іншых выданнях.

Дзяржаўная раённая газета “Астравецкая праўда” адмовілася апублікаваць перадвыбарчую праграму кандыдата ў дэпутаты Мікалая Уласевіча. У адказ на ліст Уласевіча рэдактар выдання Ніна Рыбік без належнай аргументацыі сцвярджае, што праграма Мікалая Уласевіча нібыта парушае патрабаванні ВК.

Сярод незалежных газет, якія скіраваны на поўнае асвятленне выбарчай кампаніі, крычаўскае выданне “Вольны горад”. З інтэрнэт-рэсурсамі і ў сацыяльных сетках непасрэдныя ўдзельнікі выбарчага працэсу працуюць мала.

2. *Агітацыйныя масавыя мерапрыемствы і сустрэчы з выбаршчыкамі*

Варта адзначыць, што ў параўнанні з мінулымі выбарамі значна больш кандыдатаў падалі апавяшчэнні аб правядзенні масавых мерапрыемстваў у спрошчаным парадку: у 2014 г. толькі 332 кандыдаты скарысталіся магчымасцю падачы апавяшчэння, ці 1,4% ад агульнай колькасці кандыдатаў. Было заяўлена аб правядзенні 9064 масавых мерапрыемстваў. У 2018 г. (па стане на 12 лютага) такія апавяшчэнні падаў ужо 4951 кандадат, ці 22% ад агульнай колькасці кандыдатаў. Падчас сёлетняй кампаніі кандыдаты заявілі аб правядзенні 27340 перадвыбарчых пікетаў.







У сярэднім па краіне 1 кандыдат у дэпататы мясцовых Саветаў заявіў аб правядзенні 1,2 мерапрыемстваў (на мінулых выбарах – 0,4). Традыцыйна больш актыўна агітацыйныя перадвыбарчыя пікеты заяўлялі ў Мінску: у сярэднім 1 кандыдат заявіў каля 70 масавых мерапрыемстваў.

На пытанне ці маглі ўсе кандыдаты на роўных умовах праводзіць сустрэчы з выбаршчыкамі ў вылучаных памяшканнях 30% назіральнікаў кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” паведамілі, што кандыдаты былі пазбаўленыя роўных умоў. Выбарчыя камісіі ў рэгіёнах пераважна не інфармавалі грамадскасць аб часе і месцы правядзення сустрэч з выбарчшыкамі.

Агітацыйная кампанія праўладных кандыдатаў вялася пераважна ў форме сустрэч з выбаршчыкамі ў актавых залах прадпрыемстваў. Удзел у такіх сустрэчах выбаршчыкаў-супрацоўнікаў забяспечваўся адміністрацыяй. Акрамя таго, назіральнікі кампаніі з Гродна, Баранавіч і іншых гарадоў паведамляюць, што практыка выкарыстання адміністрацыйнага

рэсурсу прымянялася ў навучальных установах. "У школах класныя кіраўнікі збіраюць бацькоў (з пашпартамі) на сустрэчы з кандыдатамі. Гэта адбываецца ўвечары. Бацькі адразу ж галасуюць датэрмінова. Сустрэчы ў школах ладзілі і кандыдаты ад дэмакратычных партый, напрыклад, ад АГП. Аднак яўка на іх была нязначная»[1]. Факты прымусу працаўнікоў да ўдзелу ў агітацыйных мерапрыемствах адзначаны назіральнікамі ў гарадах Мінск, Брэст, Орша, Глыбокае і ў іншых.

Дзеючыя дэпутаты Мінгарсавета ў перыяд перадвыбарчай агітацыі сталі браць актыўны ўдзел у афіцыйных мерапрыемствах, выкарыстоўваючы адміністрацыйны рэсурс на карысць сваёй кампаніі. Такая практыка апраўдваецца з боку раённых выбарчых камісій тым, што дэпутаты нібыта займаюцца сваімі непасрэднымі абавязкамі.

У 92% акруг, дзе назіранне ажыццяўлялі актывісты кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары", кандыдатам не адмаўлялі ў правядзенні сустрэч з выбаршчыкамі. Сустракаліся асобныя выпадкі перашкод. Так, у Оршы сарвалі сустрэчу з выбаршчыкамі кандыдата ў дэпутаты Аршанскага райсавета дэпутатаў па Цэнтральнай выбарчай акрузе № 1 Аляксандра Булаўкі.

Пад час правядзення перадвыбарчых пікетаў не ствmassа сур'езных перашкод. Аднак сустракаліся элементы ціску на пікеты апазіцыйных дзеячоў. Напрыклад, у Віцебску на пікетах апазіцыйных кандыдатаў абавязкова прысутнічалі супрацоўнікі спецслужбаў, якія вялі непрыхаваную відэафіксацыю. Гэта прыводзіла да таго, што гараджане не наважваліся падыходзіць і ўдзельнічаць у абмеркаванні праграм кандыдатаў. 8 лютага ў Светлагорску пікет кандыдата ў дэпутаты Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў па Маладзёжнай выбарчай акрузе № 57 Юрыя Ляшэнкі таксама фіксавалі супрацоўнікі спецслужбаў.

*3. Выраб і распаўсюджванне агітацыйнай друкаванай прадукцыі*

У адпаведнасці з рашэннем мясцовых уладаў на тэрыторыі выбарчых акругаў усталяваныя стэнды для агітацыйных матэрыялаў кандыдатаў у дэпутаты. Паводле назіральнікаў, на іх размяшчаюцца ўлёткі з абвесткай даты выбараў і плакаты кандыдатаў. Падобныя друкаваныя матэрыялы разносяцца і ў паштовыя скрыні. Больш актыўна агітацыя за кандыдатаў вядзецца толькі ў некаторых акругах.

Пры гэтым адзначаны факты распаўсюджвання друкаваных агітацыйных матэрыялаў без адпаведных дадзеных (нумар пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі вытворцы друкаваных выданняў, дата яго выдачы, тыраж, нумар заказу, прозвішча і ініцыялы заказчыка). Напрыклад, улёткі кандыдата па Завадской выбарчай акрузе №2 г. Магілёва Аксаны Мяньковай, толькі адна з якіх адпавядае патрабаванням. Улёткі кандыдата ў дэпутаты Бараўлянскага сельскага Савета па Другой Капішчанскай выбарчай акрузе №13 Сяргея Кандрашына таксама выраблены з парушэннем і іншае.

Назіральнікі кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" заўважылі факты рэдакцыі ці адвольнага змянення зместу агітацыйных матэрыялаў кандыдатаў ад апазіцыі. "У Слоніме на некалькіх участках ёсць альтэрнатыўныя кандыдаты – сябры Слонімскага згуртавання дэмакратычных сіл. Але ўжо пасля друкавання ўлётак яны ўбачылі, што з тэкставых матэрыялаў выкрасленыя цікавыя факты з іх біяграфій"[2].

З падачы выбарчых камісій гарадская газета "Віцьбічы" распаўсюдзіла непраўдзівыя звесткі аб наяўнасці ў Вадзіма Кузьміна, кандыдата ад партыі левых "Справядлівы свет" па Смаленскай

[1] Даступна на: http://elections2018.spring96.org/be/news/89166.
[2] Даступна на: http://elections2018.spring96.org/be/news/89166.

выбарчай акрузе №7 г. Віцебска, судзімасці. Вадзім Кузьмін звярнуўся ў гарадскую пракуратуру. Скажонымі апынуліся факты ва ўлётках кандыдата ў дэпутаты па Шклоўскай гарадской выбарчай акрузе № 54 Рыгора Кастусёва. Не ўказана істотная частка яго біяграфічных звестак, у прыватнасці, дадзеныя пра тое, што кандыдат з'яўляецца старшынёй Партыі БНФ. Першамайская раённая выбарчая камісія вырабіла інфармацыйныя матэрыялы кандытата па Карбышаўскай выбарчай акрузе №50 г. Мінска Аляксея Сігаева, не ўзгадніўшы з ім факты, важныя на думку прэтэндэнта на дэпутацкі мандат. У Астравецкім раёне падаў скаргі на падобныя дзеянні Варнянскай сельскай выбарчай камісіі кандыдат Мікалай Уласевіч.

*4. Стварэнне і выкарыстанне выбарчых фондаў кандыдатамі ў дэпутаты*

У параўнанні з мінулымі выбарамі дэпутатаў мясцовых Саветаў, падчас сёлетняй выбарчай кампаніі кандыдаты ў дэпутаты больш актыўна выкарыстоўвалі магчымасць стварэння выбарчага фонда для фінансавання выдаткаў па перадвыбарчай агітацыі. Па дадзеных ЦВК[3], па стане на 8 лютага 2018 г. з 22289 зарэгістраваных кандыдатаў выбарчыя фонды стварылі 2328, ці 10,4% ад агульнай колькасці кандыдатаў. Пры гэтым толькі 1692 кандыдаты (7,6%) выкарысталі цалкам ці часткова сродкі выбарчых фондаў. Для параўнання, падчас мінулых выбараў толькі 3,8% кандыдатаў стварылі свае выбарчыя фонды і толькі 3,5% кандыдатаў – цалкам ці часткова выкарысталі сродкі фондаў.




Кандыдаты не праяўлялі вялікай зацікаўленасці да стварэння выбарчых фондаў, хоць фармальна любыя выдаткі на правядзенне перадвыбарчай агітацыі могуць быць выкарастаныя толькі са сродкаў выбарчага фонду.

[3] Даступна на: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/Elections-MS28-elect_46-47.pdf.